Рамантыка руху

БУДАТРАД: ДОБРЫЯ ГРОШЫ І МЕСЦА Ў ІНТЭРНАЦЕ

Гісторыя студэнцкіх атрадаў вядзе свой адлік з пачатку шасцідзясятых гадоў. У тыя далёкія (па мерках сучаснай моладзі) часы навучэнцы інстытутаў і ўніверсітэтаў дапамагалі асвойваць цаліну, выхоўвалі дзяцей у піянерскіх лагерах, будавалі Байкала-Амурскую магістраль... Перажыўшы заняпад у перабудовачную эпоху, гэты рух зноў набраў моц. Сучасныя студэнты працуюць улетку праваднікамі, выратавальнікамі, важатымі... А самыя дужыя запісваюцца на два месяцы ў будаўнічы атрад.

ЗА ДЗЕНЬ — МЕСЯЧНАЯ СТЫПЕНДЫЯ

— Ад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі ў Мінску працуюць 19 будаўнічых атрадаў, у якіх уладкавана каля трохсот чалавек. Аднак выбар працы не абмяжоўваецца выключна будаўнічай сферай, — расказвае **сакратар ячэйкі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі БДУІР Ганна УЛЬРЫХ.** — Створаны і сэрвісныя атрады, і валанцёрскі атрад «Памяць», які дапамагае ветэранам вайны, прыбірае магілы невядомых салдат на вайсковых могілках... Акрамя таго, студэнтаў можна сустрэць і ў прыёмнай камісіі, дзе яны дапамагаюць абітурыентам афармляць неабходныя дакументы.

За працу, напрыклад, у будаўнічым атрадзе студэнтам абяцаюць шмат выгод. Па-першае, неблагія грошы — каля чатырох мільёнаў рублёў. Па-другое, удзельнікі атрадаў атрымаюць на дзесяць месяцаў жаданае месца ў інтэрнаце. Платнікі таксама могуць атрымаць своеасаблівы бонус у выглядзе зніжэння «цэнніку» на нятанную адукацыю. Але для гэтага ім яшчэ неабходна мець добры сярэдні бал на працягу навучальнага года.

Адметна, што ўдзельнікі будаўнічых атрадаў ужо другі год вызвалены ад выплаты падаходнага падатку. Гэта дадае ў іх кішэні некалькі соцень тысяч рублёў. Да таго ж яны маюць працоўную кніжку, картку сацыяльнага страхавання і ім налічваецца працоўны стаж. Асобным юнакам ужо прысвоілі кваліфікацыю плітачніка другога ці трэцяга разраду — дадатковая спецыяльнасць яшчэ не перашкодзіла ніводнаму чалавеку. Сёлета некаторыя будаўнічыя трэсты пайшлі яшчэ далей. Яны просяць студэнтаў выйсці на аб'ект у выхадныя, даплачваючы пры гэтым 430 тысяч рублёў за адзін працоўны дзень. А гэтая сума, між іншым, толькі крыху меншая за месячную стыпендыю...

КАМУ КЕЛЬНЮ Ў РУКІ ДАДУЦЬ?

Узводзіць новы будынак музея Вялікай Айчыннай вайны, што хутка расчыніць дзверы каля стэлы «Мінск — горад-герой», дапамагаюць пераважна другакурснікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Вучацца яны на факультэце інфармацыйных тэхналогій і кіравання. Сорак чалавек падзелены на два атрады. Нягледзячы на спякотнае ліпеньскае сонца, якое неміласэрна распаляе бетонныя пліты даху, і на спакушальна прыгожыя краявіды парку Перамогі, якія рассцілаюцца з вышыні пятага паверха, работа кіпіць. Юнакі ўкладваюць на даху звычайную дробную тратуарную плітку.

Студэнтаў, якія скончылі першы курс, тут амаль не сустрэць. Многія з іх параз'язджаліся на два летнія месяцы хто ў адпачынак, хто да бацькоў... Ды і многія бацькі не асмельваюцца адпусціць першакурснікаў на «вольны хлеб». Лічаць, што іх сыны і дачкі яшчэ не зусім дарослыя, каб зарабляць самім.

Нячастыя «госці» ў атрадзе і студэнты старэйшых курсаў: падчас вучобы яны знаходзяць сабе працу па спецыяльнасці. Праграмістам заўсёды плацяць нядрэнна, ды і работа ў іх больш камфортная, чым на будоўлі.

— А ці можна і мне ўзяць у рукі кельню? — пытаюся ў камандзіра атрада імя Пятра Машэрава Рамана Богуша.

— На жаль, я вымушаны адмовіць, — усміхаецца Раман. — Вы ж павінны прайсці медыцынскую камісію, перш чым пачаць працаваць. І абавязкова праслухаць інструктаж па тэхніцы бяспекі, здаўшы пасля адпаведны залік па ахове працы. У нас з гэтым вельмі строга. А можа, у вас алергія на будаўнічыя сумесі? Практыка паказвае, што тры з кожных дзесяці прэтэндэнтаў на месца ў атрадзе адсейваюцца менавіта на гэтым этапе.

Тэхналогія вытворчага працэсу, на першы погляд, зусім не складаная. Здавалася б, кладзі сабе плітку за пліткай ды сачы, каб яна ляжала роўна і не скасабочвалася. Аднак студэнты павінны самастойна пакласці будаўнічую сумесь, утрамбаваць яе і выраўняць. Будаўнічы атрад згорне працу толькі праз месяц, 25 жніўня. За гэты час студэнты павінны выкласці амаль шэсцьсот квадратных метраў пліткі.

КАЛІ ФІЗІЧНАЯ ПРАЦА ДАСПАДОБЫ...

— У любым выпадку гэта лепш, чым бавіць час, напрыклад, седзячы за камп'ютарам, — працягвае Раман. — З маёй групы першапачаткова ў атрад збіраліся працаўладкавацца тры чалавекі, аднак да «фінішу» дайшоў толькі я. Аднаго чалавека адгаварылі сябры: маўляў, працаваць на будоўлі для будучага праграміста — не камільфо. Другі ўладкаваўся грузчыкам у краму, але чамусьці праз два тыдні звольніўся і зараз бавіць вольны час дома. Але ж тут весялей, бо побач, як кажуць, усе свае.

Вядома, што падчас навучальнага года знайсці добра аплачваемую працу для студэнта дзённага аддзялення куды больш складана. Варыянтаў не густа, ды і з іх даводзіцца выбіраць з пастаяннай аглядкай на расклад заняткаў ва ўніверсітэце. А пары могуць скончыцца як а гадзіне, так і а чацвёртай...

— У сакавіку, калі я вучыўся на другім курсе, стараста групы прапанаваў папрацаваць улетку ў Мінску. Ды і ехаць назад у родны Барысаў не вельмі хацелася, — разважае другакурснік Павел Лахцікаў. — З досведу сваіх таварышаў ведаю, што ім удалося без асаблівых цяжкасцяў уладкавацца прадаўцамі ў крамы. Але, напрыклад, тлумачыць увесь дзень пакупнікам, як працуе мабільны тэлефон, — гэта дакладна не маё. Для мяне лепш некалькі месяцаў на год папрацаваць фізічна на адкрытым паветры.

«Удзельнікі будаўнічых атрадаў ужо другі год вызвалены ад выплаты падаходнага падатку. Гэта дадае ў іх кішэні некалькі соцень тысяч рублёў. Да таго ж яны маюць працоўную кніжку, картку сацыяльнага страхавання і ім налічваецца працоўны стаж.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СМЕЛЫМ ПЛАНАМ І АТЛАНТЫКА — НЕ ПЕРАШКОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А вось другую работу давялося шукаць цэлы месяц. На ўзбярэжжа штогод летам прыязджае вельмі шмат студэнтаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Кітая, таму канкурэнцыя надзвычай вострая. Але амерыканскіх студэнтаў там няшмат. Магчыма, таму, што за гэту работу плацяць заканадаўча вызначаны мінімум. У Н'ю-Джэрсі менш, чым 7 долараў 25 цэнтаў за гадзіну наймальнік плаціць не можа. Але з гэтай сумы вылічваюцца яшчэ і падаткі, таму «чыстымі» атрымліваецца недзе крыху больш як 6 долараў. Асноўную колькасць працуючых на курорце складаюць студэнты. Наймальнікам прасцей узяць на работу студэнта, чым плаціць за работу амерыканцу.

Урэшце, знайшлася для мяне работа ў «Макдональдсе». У прынцыпе, работнікам там даводзіцца займацца абсалютна ўсім, але асноўным маім абавязкам было ўпакоўваць кліентам заказы. Мясцовае насельніцтва і адпачывальнікі вельмі добразычліва і цярпліва ставяцца да студэнтаў, якія іх абслугоўваюць. І гэта нягледзячы на нашу… не зусім дасканалую англійскую мову.

Праз пэўны час я змяніла «Макдональдс» на работу ў парку атракцыёнаў. Кожны дзень мы працавалі на новым атракцыёне. А ў якасці бонуса ў свой выхадны дзень нам дазвалялася прыйсці, атрымаць спецыяльны браслецік і бясплатна катацца.

«I AM SORRY», «I AM SORRY»...

Жыла я ў доме, які бясплатна прадастаўляў студэнтам мой першы наймальнік. Штосьці кшталту інтэрната, з асобнымі секцыямі — для хлопцаў і дзяўчат. Пакой дзяліла з дзяўчатамі з Расіі. Так што непаразуменняў з-за рознага менталітэту ў нас не было. Увогуле, даволі шмат студэнтаў прыязджалі ў Н'ю-Джэрсі ўжо другі раз.

Дарогу ў абодва бакі студэнты аплачваюць самастойна. Але паколькі мы ляцелі па студэнцкім тарыфе, то і білеты ў нас былі самыя танныя — дарога ў Амерыку праз Маскву і назад каштавала мне недзе крыху больш як 700 долараў. Вядома, выдаткаваныя на дарогу грошы я за тры месяцы працы вярнула. Але справа ўсё ж не ў гэтым. Галоўнае, што мне ўдалося крышачку павандраваць па Амерыцы. Наведала Вашынгтон, Нью-Ёрк, Атланцік-Сіці. Але самае незабыўнае ўражанне пакінуў Ніягарскі вадаспад. Ён знаходзіцца на мяжы Злучаных Штатаў і Канады, іх аб'ядноўвае агульны водны масіў, і ў Канаду можна трапіць са Штатаў па звычайным мосце.

У Нью-Джэрсі менш чым 7 долараў 25 цэнтаў за гадзіну наймальнік плаціць не можа. Ім прасцей узяць на работу замежнага студэнта, чым плаціць за работу амерыканцу.

Што ў Амерыцы прыемна здзівіла? Напэўна, гэта ветлівасць людзей. Амерыканская ўсмешка — зусім не нацягнутая, як у нас многія памылкова лічаць. Мне здаецца, гэта звычайны стан іх душы. Усміхнуцца незнаёмаму чалавеку, павітацца з ім, нават пацікавіцца яго справамі — норма для амерыканцаў. Калі ты будзеш стаяць перад вітрынай, і амерыканцу трэба будзе прайсці паміж табой і вітрынай, ты пачуеш ад яго тысячу прабачэнняў. Там не прынята парушаць асабістую прастору іншага чалавека. У метро ніхто не будзе стаяць тварам у твар. Там пачакаюць іншы цягнік. А калі цябе раптам штурхнулі ў краме ці ў транспарце, то ад колькасці пачутых прабачэнняў ужо ты сам будзеш адчуваць сабе вінаватым.

ЗАМЕСТ САЛАТЫ — ФАСТФУД

Дарэчы, першы паход у краму стаў для мяне сапраўдным шокам — я выйшла адтуль увогуле без пакупак. Як мы звычайна дзейнічаем? Заходзім у гандлёвы пункт і накіроўваемся да паліц з таварам — знаёмыя гандлёвыя маркі, знаёмыя прадукты, знаёмыя вытворцы. У Мінску я хоць і вучыла англійскую мову, але калі зайшла ў Амерыцы ў краму, то зусім разгубілася. Фастфуд у Амерыцы каштуе танней за гародніну. І чалавеку значна прасцей купіць гатовую піцу, засунуць яе ў мікрахвалёўку і пад'есці. Гэта будзе для яго нашмат танней, чым купіць агародніну і зрабіць з яе салату. Шчыра кажучы, мы таксама грашылі фастфудам.

З бытавых момантаў вельмі здзівіла наяўнасць кандыцыянераў ва ўсіх аўтобусах (там можна было нават прастудзіцца), а таксама тое, як арганізаваны працэс мыцця бялізны. У Амерыцы не прынята мець дома пральную машыну. Але паўсюдна ёсць так званыя грамадскія пральні. Бліжэйшая да нас пральня знаходзілася ў пяці хвілінах хады. Ты прыходзіш туды са сваёй бялізнай, засыпаеш парашок, кідаеш манетку і… вольны. Можаш у гэты час пайсці, напрыклад, у краму. Затым дастаў чыстую бялізну, а побач стаіць машына для сушкі. Праз дзве хвіліны забіраеш з сабой чыстыя рэчы.

Самае частае пытанне, якое мне задавалі пасля вяртання, ці ведаюць амерыканцы пра Беларусь? (*смяецца*). Скажу так: некаторыя штосьці чулі… Дзяўчына з Казахстана расказвала, што ў яе аднойчы пацікавіліся, адкуль яна прыехала. Тая адказвае: «З Казахстана». «Казахстан — гэта там, дзе Польшча?»

Самае частае пытанне, якое мне задавалі пасля вяртання, ці ведаюць амерыканцы пра Беларусь? Скажу так: некаторыя штосьці чулі…

Мне ўвогуле здалося, што для амерыканцаў існуе Еўропа, а асобныя краіны на еўрапейскім кантыненце яны не вылучаюць. Ім вельмі складана арыентавацца ў карце Еўропы. Але я, напрыклад, не ведаю, што лепш: мець шырокі кругагляд або развівацца ў нейкай вузкай галіне? У ЗША маладыя людзі імкнуцца стаць высакакласнымі спецыялістамі менавіта ў канкрэтнай сферы.

Ці параіла б я камусьці паехаць на заробкі ў ЗША? А чаму б і не? Мая маці мяне не адгаворвала, а наадварот, падтрымала ў маіх смелых планах. Тры месяцы самастойнага жыцця ў чужой краіне, на іншым кантыненце, неабходнасць прыстасоўвацца пад іншых людзей, пад іншы менталітэт — гэта вельмі каштоўны жыццёвы вопыт. Плюс магчымасць убачыць іншую краіну. Да таго ж, у ЗША вельмі добра арганізаваны праграмы для студэнтаў, якія падчас летніх канікул жадаюць падзарабіць.

Надзея НІКАЛАЕВА.